# Ніколі не забудзем

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

мы не жывёла, якую спакойна гоняць пад нож, што мы можам абараняць сябе і паміраем са зброяй. Цяпер увесь свет ведае назву мястэчка Лахва – гэта наша яўрэйская Хатынь, гэта першае супраціўленне гета фашыстам.

Сваім абавязкам лічыць захаванне памяці аб трагедыі Лахвенскага гета дырэктар школы ў Халоне (Ізраіль) Рафі Тальбі:

– Людзі, якія тут пахаваны, загінулі толькі за тое, што былі яўрэямі. Помнік раскажа ўсяму чалавецтву, што ў лахвенскай зямлі засталіся сем'і многіх ізраільцян. Помнік закліча да барацьбы супраць подласці і дыскрымінацыі. Помнік выхавае ў маладога пакалення ізраільцян павагу да цяперашніх жыхароў Лахвы, якія памятаюць пра сваіх загінуўшых суседзяў і сяброў. Мы верым, што жыццё стане лепшым, таму што так завяшчалі тыя, хто тут пахаваны.

Урачыстая хвіліна адкрыцця помніка. Члены дэлегацыі Ізраіля кладуць на пастамент чырвоныя і жоўтыя ружы. Ускладаюцца карзіны кветак ад райсавета і гаркама КПБ, вянкі – ад Лахвенскага сельсавета, калгасаў „Новае Палессе", „Перамога", Лахвенскага савета ветэранаў вайны і працы, іншых калектываў. Многія ўдзельнікі мітынгу таксама паклалі букеты вяргінь і гваздзік.

Цырымонія адкрыцця помніка заканчваецца. Але людзі яшчэ доўга не разыходзяцца, радуючыся рэдкай магчымасці паразмаўляць са сваімі землякамі з іншых гарадоў краіны і з-за мяжы.

Хочацца спадзявацца, што помнік ахвярам фашызму ў Лахве нагадае жыхарам астатніх вёсак аб патрэбнасці ўшанавання ўсіх загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай. Пра гэта гаварыў старшыня калгаса „Новае Палессе" В. С. Гаргун:

– Мне сорамна, што помнік, дастойны памяці загінуўшых, пабудаваны толькі праз некалькі дзесяцігоддзяў. Давайце своечасова аддаваць даніну павагі жывым і мёртвым, каб не шкадаваць потым аб спазненні.

На пастаменце помніка на рускай мове і на іўрыце выбіты залаты надпіс: „Тут у 1942 годзе зверскі расстраляны нямецкімі фашыстамі 1946 савецкіх грамадзян". Ля падножжа ў шасці імправізаваных падсвечніках гараць свечы – у памяць аб шасці мільёнах яўрэях – ахвярах фашызму. Былыя лахвенцы – жыхары Ізраіля паказалі нам прыклад пайменнага ўшанавання загінуўшых. Цяпер павінны працаваць над гэтым і мы, складаючы кнігу „Памяць" Лунінецкага раёна.

Т. КАНАПАЦКАЯ.





НА ЗДЫМКАХ: радуецца сустрэчы з роднай зямлёй удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, грамадзянін Ізраіля Ліор Ліхтэнштэйн – летапісец трагедыі Лахвенскага гета; кветкі ўскладаюць ураджэнцы Лахвы – цяперашнія жыхары іншых гарадоў краіны і Ізраіля.

Фота Р. ЖУКА.

нічаюць на мітынгу. Яго адкрывае старшыня Лахвенскага сельскага Савета народных дэпутатаў М. Н. Цяльпук. Слова даецца намесніку старшыні райвыканкама А. Б. Харламаву:

– Мы стаім на гераічнай зямлі, залітай крывёю савецкіх яўрэяў 3 верасня 1942 года. Подзвіг людзей, асуджаных на смерць, не знікне з людской памяці. У гонар іх сёння адкрываецца абеліск. Няхай ён ушаноўвае светлую памяць загінуўшых. Няхай ён будзе перасцярогай тым, хто задумвае новыя войны. Няхай будзе наша беларуская зямля пухам загінуўшым. Прашу вас ушанаваць памяць ахвяр фашызму хвілінай маўчання.

Аб трагічных і гераічных падзеях Вялікай Айчыннай расказваюць людзі, якія ведаюць вайну не з літаратуры. Старшыня праўлення раённага аддзялення Савецкага фонду міру І.М. Паўлюкавец: сям'я яго бацькі была забіта і спалена ў Мелясніцы; старшыня Лахвенскага савета ветэранаў вайны і працы М. У. Янковіч; цяперашні пінчанін Р. І. Хейфец, удзельнік паўстання ў Лахвенскім гета.

Многія ўраджэнцы вёскі, якія цяпер жывуць у іншых краінах, прыехалі, каб успомніць адзін аднаго.

Цяперашняя мінчанка Роза Абрамаўна Герасімава ў 1940-м годзе стала камсамолкай. У пачатку вайны здолела пайсці з Лахвы, знайшла прытулак у сваякоў у Леніне, але хутка і там стала вязнем гета. Давялося б раздзяліць лёс маці, бацькі, братавай і двух пляменнікаў, забітых у Лахвенскім гета, але выратавалі партызаны.

Пашчасціла збегчы з гета ў жудасны дзень трагедыі Барысу Далгапятаму. Уступіў у партызанскі атрад, ваяваў у любанскіх лясах, што на Міншчыне, мае баявыя ўзнагароды. Паўстагоддзя не бачыўся ён, жыхар Ізраіля, з суседам Мікалаем Адамавічам Мархоткам. Абодва з усмешкамі ўспамінаюць, як частавалі адзін аднаго мацой і салам.

Копыль Калпаніцкі страціў у час трагедыі двух братоў, сястру, маці. Сам выратаваўся. Адпомсціў за гібель родных, змагаючыся ў партызанскім атрадзе імя Сталіна. Разам з братамі па зброі прайшоў баявы шлях па палескіх лясах і балотах да вызвалення Беларусі. Цяпер былы лахаўчанін жыве ў Ізраілі. Гэта дзякуючы яго актыўным намаганням адкрыты помнік у Лахве. Тут са слязамі на вачах сустракаюцца прадстаўнікі мясцовага сельсавета, кіраўніцтва калгасаў „Новае Палессе" і „Перамога", членаў Лахвенскай абшчыны ў Ізраілі.

Сапраўды добрыя і шчырыя адносіны сучасных жыхароў Лахвы да гасцей сведчаць аб шматвекавых традыцыях дружбы людзей розных нацыянальнасцей, што калісьці пражывалі ў мястэчку. Аб гэтым гаварыў на мітынгу грамадзянін Ізраіля Ліор Ліхтэнштэйн:

– Дарагія землякі! Звяртаюся да вас так, таму што я – родам з Лахвы, а землякі – гэта нават больш чым сваякі. І трагедыя яўрэйскага насельніцтва гэта даказала. Мы ведаем імёны фашысцкіх катаў нашага гета – я сам быў сведкам на судовым працэсе над імі ў Германіі. Мы ведаем імёны здраднікаў савецкага народа – паліцэйскіх, але сярод іх няма ніводнага жыхара Лахвы. Наадварот, нашы беларускія суседзі спрабавалі дапамагчы нашым жанчынам і дзецям, праявілі сябе,як нашы браты. Не ўдалося ім выратаваць лахвенскіх яўрэяў – вельмі моцныя былі сілы ў захопнікаў, але такая салідарнасць дапамагла нам даказаць, што

(Заканчэнне на 2-й стар.).